Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУhttp://www.philology.bsu.by

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ**

**ЗАЦВЯРДЖДАЮ**
Дэкан філалагічнага факультэта
Беларускага дзяржаўнага універсітэта

________________ прафесар І. С. Роўда
____________________

Рэгістрацыйны № УД-______/баз.

# МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

**Вучэбная праграма для спецыяльнасці:**
**1–21 05 01 Беларуская філалогія**

2008 г.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУhttp://www.philology.bsu.by



**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

*Л. М. Гамеза,* дацэнт кафедры рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;

*І. М. Саматыя,* дацэнт кафедры рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта, кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

кафедра сучаснай беларускай мовы Беларускага дзяржаўнага універсітэта;

*І. І. Паўлоўскі,* галоўны навуковы супрацоўнік Навукова-даследчага цэнтра Навукова-метадычнай установы "Нацыянальны інстытут адукацыі" Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, доктар педагагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ**:

Кафедрай рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта (пратакол № 3 ад 15 кастрычніка 2008 г.);

Навукова-метадычным саветам філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта (пратакол № 2 ад 28 кастрычніка 2008 г.)

Адказны за рэдакцыю: І. М. Саматыя

Адказныя за выпуск: Л. М. Гамеза, В. Ю. Дылеўская

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУhttp://www.philology.bsu.by



# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Курс "Методыка выкладання беларускай мовы ў школе" – прафілюючая дысцыпліна на філалагічных факультэтах дзяржаўных універсітэтаў. Ён заснаваны на навуковай метадалогіі, гісторыі моўнай адукацыі на Беларусі, дасягненнях сучаснай лінгвістычнай, педагагічнай, псіхалагічнай, метадычнай навукі і паказвае спецыфіку навучання беларускай мове як роднай і другой, тэарэтычна і практычна рыхтуе студэнтаў да прафесійнай дзейнасці настаўніка беларускай мовы.

**Мэты і задачы** курса:

– забяспечыць студэнтаў (будучых настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры) тэарэтычнымі ведамі, практычнымі ўменнямі і навыкамі ў галіне методыкі беларускай мовы – асновы эфектыўнай арганізацыі працы па максімальна поўным і трывалым засваенні школьнікамі праграмнага матэрыялу па беларускай мове;

– развіваць ў студэнтаў прафесійна-метадычныя ўменні фарміраваць у школьнікаў як лінгвістычную, моўную, этнакультурную, так і маўленчую, камунікатыўную кампетэнцыю;

– фарміраваць у студэнтаў навыкі самастойнай працы з вучэбна-метадычнай літаратурай, развіваць уменні весці пошуковую і навукова-даследчую працу.

Курс “Методыкі выкладання беларускай мовы” ўключае: лекцыі па методыцы беларускай мовы (36 гадзін), практычныя заняткі (34 гадзіны), кантроль самастойнай працы (16 гадзін ), пісьмовыя работы, бягучыя і індывідуальныя кансультацыі, залік, дзяржаўны экзамен.

Асноўная задача лекцыйных заняткаў

**Змест курса** методыкі беларускай мовы: методыка беларускай мовы як навука, агульныя пытанні выкладання беларускай мовы у школе (мэты, задачы, змест, прынцыпы, метады навучання беларускай мове; тыпалогія ўрокаў беларускай мовы); методыка вывучэння асобных раздзелаў (методыка навучання культуры маўлення, тэкстаўтварэнню, стварэнню тэкстаў розных жанрава-стылёвых разнавіднасцей; методыка навучання фанетыцы і гукавому аспекту маўлення, графіцы і арфаграфіі; методыка лексікі і ўзбагачэнне слоўнікавага запасу школьнікаў; методыка словаўтварэння і праца над значымымі часткамі слова; методыка марфалогіі, сінтаксісу і ўзбагачэнне граматычнага ладу мовы школьнікаў, методыка пунктуацыі); арганізацыя пазакласнай працы.

У працэсе метадычнай падрыхтоўкі ў студэнтаў фарміруюцца асноўныя прафесійныя **ўменні**:

– разуменне канцэптуальных асноў моўнай адукацыі: мэты, зместу, прынцыпаў навучання; вызначаць мэты, задачы навучання школьнікаў розных класаў з улікам узроставых і індывідуальных асаблівасцей;

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУhttp://www.philology.bsu.by



– рэалізоўваць пазнавальныя і практычныя, развіццёвыя, выхаваўчыя мэты навучання беларускай мове на кожным уроку;

– дасканала ведаць вучэбныя праграмы па беларускай мове, падручнікі, нарматыўную базу (адукацыйны стандарт, прадметныя нормы і сістэму ацэнкі вучэбных дасягненняў школьнікаў, моўны рэжым і інш.); валодаць сучаснымі тэхналогіямі навучання, якія забяспечваюць паўнацэннае развіццё асобы школьніка-суб'екта свядомай дзейнасці – як моўна-эстэтычнага ідэалу;

– умець выконваць метадычны аналіз матэрыялаў, якія неабходна засвоіць школьніку (дыферэнцыраваць яго па ступені цяжкасці, правільна суадносіць колькасць тэарэтычных ведаў і практычных уменняў і навыкаў, вусных і пісьмовых заданняў; аналізаваць азначэнні і правілы, бачыць пераемнасць і перспектыўнасць у навучанні, ажыццяўляць скрытае (латэнтнае) супастаўленне і супрацьпаўстаўленне сістэм беларускай, рускай, вывучаемых замежных моваў з мэтай паказу спецыфікі, адметнасці і непаўторнасці роднай мовы, яе месца сярод іншых моваў свету, выхавання павагі да моў іншых народаў;

– спалучаць працу па навучанні школьнікаў сістэме мовы з фарміраваннем камунікатыўных уменняў.

Акрамя таго, у студэнтаў фарміруюцца **прыватныя прафесійныя ўменні**:

– ажыццяўляць матывацыю вучэбнай дзейнасці школьнікаў;

– задаваць пытанні і фармуляваць заданні;

– праводзіць апытванне і аб'ектыўна ацэньваць веды, уменні і навыкі школьнікаў;

– праводзіць розныя віды дыктантаў;

– рыхтаваць школьнікаў да вуснага і пісьмовага узнаўлення прапанаваных тэкстаў (стварэння другасных на аснове арыгінальных тэкстаў), стварэння уласных тэкстаў розных жанраў і стыляў мовы ў вуснай і пісьмовай форме;

– выконваць лінгва-стылістычны аналіз тэкстаў;

– умець падбіраць патрэбны дыдактычны матэрыял да ўрокаў;

– карыстацца прынятымі ў школе ўмоўна-графічнымі абазначэннямі;

– выкарыстоўваць тэхнічныя сродкі навучання і сродкі нагляднасці ў вучэбным працэсе.

Форма кантролю ведаў – залік.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУhttp://www.philology.bsu.by



## Прыкладны тэматычны план курса
## “Методыка выкладання беларускай мовы”

| Назвы раздзелаў і тэм | Колькасць гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | Лекцыі | Практычныя заняткі | Кантралюемая самастойная праца (КСП) |
| 1. Уводзіны. Методыка беларускай мовы як навука | 2 | 2 | |
| 2. Станаўленне і развіццё метадычнай думкі на Беларусі | | | 4 |
| 3. Беларуская мова як вучэбны прадмет у сучаснай школе | 2 | 2 | |
| 4. Асноўныя заканамернасці засваення мовы і прынцыпы навучання мове | | 2 | 2 |
| 5. Змест і структура школьнага курса беларускай мовы | 2 | 2 | |
| 6. Метады навучання беларускай мове: класіфікацыя і характарыстыка | 4 | 4 | |
| 7. Сродкі навучання беларускай мове | 2 | 2 | |
| 8. Арганізацыя вучэбнага працэсу па беларускай мове ў школе | 6 | 4 | 2 |
| 9. Методыка раздзелаў школьнага курса беларускай мовы | | | |
| 9. 1. Методыка фанетыкі | 2 | 2 | |
| 9.2. Методыка лексікі | 2 | 2 | |
| 9.3. Методыка словаўтварэння | 2 | 2 | 2 |
| 9.4. Методыка арфаграфіі | 2 | 2 | 2 |
| 9.5. Методыка марфалогіі | 2 | 2 | |
| 9.6. Методыка сінтаксісу | 2 | 2 | 2 |

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУhttp://www.philology.bsu.by



| | | | |
|---|---|---|---|
| 9.7. Методыка пунктуацыі | 2 | 2 | |
| 9.8. Методыка развіцця звязнага маўлення вучняў | 4 | 2 | 2 |
| **Колькасць гадзін:** | **36** | **34** | **16** |
| **У выніку** | **86** | | |

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУhttp://www.philology.bsu.by



# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ
## курса "Методыкі выкладання беларускай мовы"

### 1.Агульныя пытанні методыкі беларускай мовы ў школе
### 1.1. Методыка беларускай мовы як навука

Методыка беларускай мовы як навука аб навучанні і выхаванні школьніка як моўнай асобы; аб’ект, прадмет, змест, задачы, фундаментальныя паняцці і катэгорыі (мэты і змест моўнай адукацыі, працэс навучання мове, заканамернасці засваення мовы і заканамернасці навучання мове, прынцыпы і метады навучання мове, формы навучання, моўнае ядро асобы школьніка, моўная, маўленчая, сацыякультурная кампетэнцыі).

Сувязь методыкі з іншымі навукамі: філасофіяй, псіхалогіяй, педагогікай (у тым ліку дыдактыкай), лінгвістыкай, псіхалінгвістыкай, сацыялінгвістыкай, літаратуразнаўствам і інш.

Агульная характарыстыка псіхолага-педагагічнага даследавання. Тэарэтычныя асновы і праблематыка сучасных псіхолага-педагагічных даследаванняў. Крыніцы і ўмовы даследчага пошуку. Арганізацыя вопытна-пошуковай даследчай працы. Характарыстыка метадалагічных прынцыпаў псіхолага-педагічных даследаванняў.

Лагічная структура навукова-метадычнага даследавання: вызначэнне аб’екта і прадмета даследавання; мэты і задачы даследавання, ідэя, задума і гіпотэза як тэарэтычнае ядро даследавання; правядзенне канстатавальнага, навучальнага і кантрольнага эксперыментаў; крытэрыі паспяховасці даследавання і маніторынг працэсу і яго вынікаў.

Метады псіхолага-педагагічнага даследавання: вывучэнне метадычнай спадчыны, тэарэтычны аналіз, назіранне за вучэбным працэсам, навукова-педагагічны эксперымент (канстатавальны, навучальны, кантрольны), аналіз вучнёўскіх прац, анкетаванне, тэсціраванне, мадэліраванне і інш.

Вытлумачэнне, апрабацыя і афармленне вынікаў даследвання: інтэрпрэтацыя вынікаў даследвання, апрабацыя работы, афармленне вынікаў пошуку.

### Методыка выкладання беларускай мовы як вучэбная дысцыпліна

Методыка выкладання беларускай мовы як вучэбная дысцыпліна, яе прадмет, задачы. Спецыфіка методыкі выкладання беларускай мовы як дзяржаўнай (беларуская мова ў школах з беларускай і рускай мовамі навучання). Сацыялінгвістычныя і псіхалінгвістычныя перадумовы адбору зместу навучання мовам у беларускай школе.

Характарыстыка асноўных дапаможнікаў па методыцы выкладання беларускай мовы.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУhttp://www.philology.bsu.by



## 1.2.Станаўленне і развіццё метадычнай думкі на Беларусі

Асветніцкая дзейнасць Ф. Скарыны. Аўтары першых славянскіх буквароў і граматык (І.Ужэвіч, Л. і С.Зізаніі, М. Сматрыцкі, С. Собаль, С. Полацкі). Роля Б. Тарашкевіча, П. Пачобкі, А. Смоліч, Я. Лёсіка, І. Самковіча, І. Пратасевіча, Н. Шэўчыка, В. Самцэвіча, А.В. Багдановіча і інш. у станаўленні і развіцці методыкі роднай мовы. Метадычная спадчына К. Міцкевіча і В. Тэпіна.

Актывізацыя метадычнай думкі у 60-70 і 80-90 гады XX стагоддзя: роля Л. П. Падгайскага, В. У. Протчанкі, У. К. Андрэенкі, М. С. Яўневіча, Я. М. Лаўрэля, М. Г. Яленскага, С. А. Язерскай і інш. у развіцці методыкі выкладання беларускай мовы як навукі. Беларускія педагагічныя часопісы, іх роля ў асэнсаванні і распаўсюджанні педагагічнай тэорыі і перадавога педагагічнага вопыту.

Лінгваметадычная кампаратывістыка: моўная адукацыя ў перадавых краінах свету і школах Беларусі.

## 1.3.Беларуская мова як вучэбны прадмет у сучаснай школе

Родная мова – прадмет вывучэння, сродак навучання, фарміравання і развіцця асобы школьніка. Канцэпцыя моўнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Адукацыйны стандарт па беларускай мове: прызначэнне, змест, структура.

**Мэта навучання** беларускай мове ў школе і іншых сярэдніх вучэбных установах розных тыпаў – фарміраванне моўнай асобы, сапраўднага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, удумлівага чытача, адукаванага суразмоўніка, спагадлівага, высакароднага чалавека.

**Задачы**, якія неабходна вырашыць для рэалізацыі дадзенай мэты:

– развіццё і выхаванне школьнікаў сродкамі беларускай мовы;

– авалоданне імі беларускай мовай як сродкам зносін і пазнання свету;

– засваенне ведаў пра будову і функцыянаванне беларускай мовы;

– фарміраванне здольнасці эфектыўна выкарыстоўвасць беларускую мову ў розных сферах сваёй дзейнасці;

– набыццё моўнай, маўленчай, лінгвістычнай і этнакультурнай кампетэнцыі.

Спецыяльныя і агульнапрадметныя мэты навучання мове ў сучаснай школе.

**Спецыяльныя мэты навучання беларускай мове:**

а) **п а з н а в а л ь н ы я:**

– фарміраванне ў школьнікаў лінгвістычнага светапогляду (**лінгвістычная** кампетэнцыя, у склад якой уваходзіць і **этнакультурная** кампетэнцыя);

– узбраенне школьнікаў асновамі ведаў аб мове і маўленні (**моўная** кампетэнцыя);

– эстэтычнае выхаванне дзяцей сродкамі беларускай мовы як вучэбнага прадмета (у пэўнай меры – **этнакультурная** кампетэнцыя);

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУhttp://www.philology.bsu.by



б) **п р а к т ы ч н ы я  м э т ы:**

– фарміраванне арфаграфічных і пунктуацыйных уменняў і навыкаў;

– узбраенне школьнікаў нормамі літаратурнай мовы;

– удасканаленне маўленчай дзейнасці школьнікаў: навучанне гаварэнню, слуханню, чытанню, пісьму; навучанне зносінам, камунікацыі.

**Агульнапрадметныя мэты навучання беларускай мове:**

– выхаванне школьнікаў;

– развіццё лагічнага мыслення;

– навучанне школьнікаў самастойнаму папаўненню ведаў аб мове.

Асноўныя **канцэпцыі навучання** беларускай мове: лінгвацэнтрычная і антрапацэнтрычная (асобасна арыентаваная).

## 1.4.Асноўныя заканамернасці засваення мовы і прынцыпы навучання мове

Асноўныя **заканамернасці засваення мовы** як роднай і другой:

– авалоданне мовай пачынаецца з авалодання яе гукавой матэрыяй;

– мовай авалодваюць тады, калі засвойваюць моўныя значэнні;

– семантычная бесканфліктнасць рэцэпцыі;

– унутраная міжмоўная ідэнтыфікацыя;

– узаемаўплыў пісьмовай і вуснай мовы пры фарміраванні маўленчых навыкаў;

– вызначальная роля спецыяльна створанага развіццёвага маўленчага асяроддзя.

## Асноўныя прынцыпы навучання мове

Асноўныя **дыдактычныя прынцыпы** навучання мове:

– развіццёвага і выхаваўчага характару;

– навуковасці зместу навучання і метадаў вучэбнага працэсу;

– сістэматычнасці і паслядоўнасці ў авалоданні ведамі пры фарміраванні уменняў і навыкаў;

– свядомасці, творчай актыўнасці і самастойнасці школьнікаў;

– прынцып нагляднасці, адзінства канкрэтнага і абстрактнага, рацыянальнага і эмацыянальнага, рэпрадуктыўнага і прадуктыўнага пры арганізацыі вучэбнага працэсу;

– даступнасці навучання;

– трываласці вынікаў навучання;

– рацыянальнага спалучэння калектыўных і індывідуальных формаў вучэбнай дзейнасці школьнікаў;

– пераемнасці і перспектыўнасці;

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУhttp://www.philology.bsu.by



– сувязі вывучэння мовы і літаратуры.

Сучасныя **дыдактычныя прынцыпы** арганізацыі адукацыйнай дзейнасці вучняў:

– антрапалізацыя адукацыі;
– успрыманне вучэбнага прадмета з пазіцый асобасных патрэб;
– педагагічнай кангеніяльнасці і свабоды ў развіцці асобы;
– адукацыйнага працэсу.

**Лінгвадыдактычныя прынцыпы навучання** беларускай мове:

– увагі да матэрыі мовы;
– ацэнкі выразнасці мовы;
– развіцця “ моўнай чуйнасці”;
– каардынацыі вуснай і пісьмовай мовы;
– структурна-семантычны;
– апора на этнакультуру;
– функцыянальна-камунікатыўнай накіраванасці;
– накіраванасці працэсу навучання на паўнавартаснае фарміраванне і развіццё моўнай асобы школьніка;
– уліку фактару бікультурнага развіцця дзіцяці;
– скіраванасці навучання на асэнсаванне беларускай мовы як этнакультурнага гістарычнага асяроддзя;
– арыентацыі працэсу навучання на засваенне літаратурнай нормы з мэтай фарміравання асобы вучня як моўна-эстэтычнага ідэалу;
– прынцып забеспячэння інтэлектуальнага і індывідуальнага развіцця школьнікаў;
– прынцып апераджальнага развіцця рэцэптыўных здольнасцей дзіцяці.

## 1.5.Змест і структура школьнага курса беларускай мовы

**Склад сучаснага** школьнага курса беларускай мовы: **веды** аб мове і маўленні, моўныя і маўленчыя **ўменні** і **навыкі, спосабы дзейнасці** з вучэбным матэрыялам.

Адпаведнасць мэце моўнай адукацыі, забяспячэнне цэласнага развіцця асобы школьніка, практычная значнасць, адпаведнасць рэальным узроставым магчымасцям, адпаведнасць аб’ёму зместу навучання вучэбнаму плану, структурнае адзінства на розных этапах навучання і інш.

**Прынцыпы мінімізацыі навуковага курса** беларускай мовы для школы: светапоглядны, сістэмны, функцыянальны, эстэтычны, камунікатыўны, практычны, гістарычны і міжпрадметны; улік функцыянальна-семантычных асаблівасцей і значнасці моўнай з’явы для маўленчай дзейнасці; улік тэкстаўтваральнай ролі моўнага і маўленчага матэрыялу; улік ролі моўнай з’явы у стварэнні тэкстаў розных жанраў і тыпаў маўлення і інш.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУhttp://www.philology.bsu.by



**Прынцыпы фарміравання складу ўменняў і навыкаў** для школьнага курса мовы: логіка-пазнавальны, частотна-нарматыўны, адноснай арфаграфічнай і пунктуацыйнай пісьменнасці, логіка-функцыянальны і інш.

**Структура** сучаснага курса беларускай мовы.

Сучасныя **праграмы** па беларускай мове для устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання з 11-гадовым тэрмінам навучання.

**Склад** праграм: тлумачальная запіска, уласна праграма. **Структура** праграм ў цэлым: сукупнасць пакласных праграм. Узровень праграмы кожнага класа. Структура моўнай і маўленчай часткі школьнага курса. Асноўныя лінгвістычныя і маўленчазнаўчыя паняцці курса беларускай мовы.

## 1.6.Метады навучання беларускай мове: класіфікацыя і характарыстыка

Тыпалогія метадаў навучання: традыцыйна-класічныя (славесныя, практычныя і інш.) і асобасна арыентаваныя (эўрыстычныя, крэатыўныя, кагнітыўныя, прадуктыўныя і інш.) метады.

Асновы для тыпалогіі метадаў навучання: **паступовае ўзрастанне актыўнасці і самастойнасці школьнікаў** (дагматычныя, рэпрадуктыўныя, тлумачальна-ілюстратыўныя, прадуктыўныя, эўрыстычныя, часткова-пошукавыя, праблемныя, даследчыцкія), **па этапах вучэбнага працэсу (**метады, якія прымяняюцца на этапе матывацыі і стымулявання; метады, што прымяняюцца на этапе засваення новага матэрыялу; метады замацавання; метады кантролю і ацэнкі і інш). Метады практычныя і тэарэтычныя; метады, што прымяняюцца толькі ў адным з раздзелаў курса (метады развіцця маўлення, метады навучання арфаграфіі і інш).

**Характарыстыка метадаў навучання:**

лекцыя, паведамленне настаўніка, гутарка, назіранне і моўны аналіз( моўны аналіз тэксту; сінтаксічны аналіз у межах сказа; марфалагічны аналіз часціны мовы і яе формаў; марфемны і словаўтваральны аналіз; аналіз ці характарыстыка лексікі; фанетычны аналіз: фанемы, гукі, літары, націскі; элементы стылістычнага аналізу, ацэнкі культуры маўлення); самастойны аналіз вучнямі матэрыялу; самастойная работа з падручнікам і другімі крыніцамі і інш.;

пытанні, канспектаванне, складанне плана, тэзісаў, моўных табліц, разгорнуты адказ па граматыцы, алгарытмы, вуснае паведамленне, даклад на лінгвістычную тэму;

знаходжанне вывучаемай моўнай з’явы, класіфікацыя, дыферэнцыяцыя, сістэматызацыя, падбор прыкладаў і інш.;

розныя віды спісвання, пісьмо па памяці, розныя віды дыктантаў;

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУhttp://www.philology.bsu.by



метады слоўнікавай працы, метады фарміравання граматычнага ладу маўлення і навучання нормам літаратурнай мовы; метады функцыянальна-стылістычнай працы, метады навучання звязным выказванням.

**Кантрольна-ацэначная дзейнасць на ўроках беларускай мовы.** Асноўныя патрабаванні да арганізацыі кантролю ведаў, уменняў і навыкаў вучняў па беларускай мове. Дзесяцібальная сістэма і нормы ацэнкі вучэбных дасягненняў школьнікаў па беларускай мове. Віды, функцыі, метады кантролю і вызначэнне якасці моўнай адукацыі.

## 1.7. Сродкі навучання беларускай мове

Вучэбна-метадычны комплекс па беларускай мове, яго асноўныя кампаненты.

*Падручнік* – асноўны сродак навучання роднай мове. Псіхолага-педагагічныя ( змястоўныя, інтэгратыўныя і метадычныя) і санітарна – гігіенічныя патрабаванні да школьнага падручніка: адпаведнасць адукацыйнаму стандарту і вучэбнай праграме, сучаснаму стану развіцця навукі, практычная накіраванасць, структурная цэласнасць, выразнасць і дакладнасць мовы, даступнасць фармулёвак, ілюстраванасць, адпаведнасць патрабаванням санітарных правілаў і нормаў, зацверджаных Міністэрствам аховы здароўя.

Функцыі падручніка: інфармацыйная, трансфармацыйная, сістэматызавальная, навучальная, развіццёвая, выхаваўчая.

Структурныя кампаненты падручніка па мове для школ: тэкставы (навукова-тэарэтычны, практычны матэрыял), пазатэкставы (апарат арганізацыі засваення матэрыялу, ілюстрацыі, малюнкі, схемы, табліцы, памяткі і інш.), даведачны (слоўнікі), апарат арыенціроўкі (умоўныя абазначэнні, змест). Характарыстыка для чытання і аналізу, пераказу і інш.; дапаможнікі па развіцці маўлення школьнікаў: тэмы і планы сачыненняў, зборнікі тэкстаў для пераказаў, узоры і інш.; слоўнікі, даведнікі энцыклапедычнага тыпу; кнігі для дадатковага чытання і мн. інш.)

***Сродкі нагляднасці*** ў навучанні беларускай мове: сродкі зрокавай нагляднасці, сродкі слыхавай нагляднасці, зрокава-слыхавыя сродкі навучання. Іх прызначэнне ў навучальным працэсе.

## 1.8. Арганізацыя вучэбнага працэсу па беларускай мове ў школе

***Планаванне працы*** па беларускай мове. *Каляндарныя, тэматычныя і паўрочныя планы* работы настаўніка беларускай мовы. Мэты і задачы планавання вучэбнага матэрыялу.

**Формы арганізацыі вучэбнага працэсу па беларускай мове ў школе.**

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУhttp://www.philology.bsu.by



***Урок*** **–** асноўная форма вучэбнай работы ў школе. Сучасныя патрабаванні да ўрока беларускай мовы. Структурныя кампаненты ўрока і іх функцыі**. Тыпы ўрокаў** роднай мовы ў залежнасці ад этапаў працы над вучэбным матэрыялам, мэтаў і задач навучання: урок засваення новых ведаў і фарміравання ўменняў і навыкаў; урок замацавання ведаў, развіцця ўменняў і навыкаў; урокі паўтарэння матэрыялу і развіцця ўменняў і навыкаў; урок абагульнення і сістэматызацыі ведаў, удасканалення ўменняў і навыкаў; камбінаваны ўрок; урок праверкі ведаў, уменняў і навыкаў; ўрок развіцця звязнага маўлення; урок аналізу пісьмовых работ (кантрольных дыктантаў, пераказаў, сачыненняў і інш.).

***Іншыя формы*** арганізацыі навучання: індывідуальныя заняткі (рэпетытарства, цьютарства, саманавучанне, хатняе навучанне), калектыўна-групавыя заняткі: нетрадыцыйныя ўрокі (урок-лекцыя, урок-семінар, ўрок-залік, урок-практыкум і інш.), канферэнцыі, алімпіяды, цэнтралізаванае тэсціраванне і інш.

**Альтэрнатыўныя формы навучання:** батаўская сістэма, Дальтан-план, план Трампа, лекцыйна-семінарскія заняткі, групавое навучанне і інш.

Камп’ютарнае навучанне ў сістэме агульнай сярэдняй адукацыі.

**Пазакласная праца па беларускай мове.**Значэнне і задачы пазакласнай працы па беларускай мове. Прынцыпы арганізацыі пазакласнай працы. Формы пазакласнай працы. Віды пазакласных мерапрыемстваў, методыка іх правядзення.

**Метадычная праца настаўнікаў беларускай мовы.** Кваліфікацыйныя і прафесійныя патрабаванні да настаўніка беларускай мовы. Настаўнік як моўная асоба. Значэнне метадычнай працы ў сучаснай школе. Формы ўдасканалення метадычнага майстэрства настаўнікаў. Змест работы метадычных аб’яднанняў (кафедраў). Педагагічныя інавацыі. Школьны кабінет беларускай мовы.

## 2.МЕТОДЫКА РАЗДЗЕЛАЎ ШКОЛЬНАГА КУРСА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

### 2.1. Методыка фанетыкі

Значэнне, мэты і задачы вывучэння фанетыкі ў школьным курсе беларускай мовы. Агульнаметадычныя і прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння гукавога боку мовы. Змест і будова курса фанетыкі. Супастаўленне фанетычных сістэм беларускай і рускай мовы з мэтай папярэджання інтэрферэнцыі. Арфаэпічныя нормы беларускай мовы.

Асноўныя віды фанетычных практыкаванняў. Фанетыка-графічны разбор і методыка яго правядзення.

Усталяванне ўнутрыпрадметных сувязей паміж вывучэннем фанетыкі і арфаграфіі, словаўтварэння, марфалогіі, сінтаксісу, пунктуацыі, культурай маўлення.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУhttp://www.philology.bsu.by



## 2.2. Методыка лексікі

Значэнне, задачы, месца лексікі ў школьным курсе беларускай мовы. Прынцыпы вывучэння лексікі. Лінгвістычныя асновы школьнага курса лексікі, яго змест.

Лексічная норма. Тыпалогія маўленчых памылак, прычыны з'яўлення, улік.

Метады і прыёмы вывучэння лексікі і ўзбагачэння слоўнікавага запасу. Лексічныя і слоўнікавыя практыкаванні.

Сэнсава-стылістычная і тэкстаўтваральная функцыя лексічных з'яў.

Методыка работы з тлумачальнымі слоўнікамі на ўроках беларускай мовы.

## 2.3. Методыка словаўтварэння

Значэнне, задачы навучання словаўтварэнню. Лінгвістычныя асновы школьнага курса словаўтварэння, яго змест. Спецыфічныя прынцыпы вывучэння словаўтварэння.

Словаўтваральная норма. Методыка работы з марфемным і словаўтваральным слоўнікамі.

Тыпалогія словаўтваральных практыкаванняў. Марфемны і словаўтваральны разборы. Методыка правядзення.

Аналіз тэксту пры вывучэнні словаўтварэння. Роля аднакаранёвых і вытворных слоў у тэксце.

Лінгваметадычная сістэма ўзбагачэння слоўнікавага запасу школьнікаў пры вывучэнні словаўтварэння.

Выпрацоўка арфаграфічных уменняў і навыкаў пры вывучэнні словаўтварэння.

## 2.4. Методыка арфаграфіі

Значэнне, этапы, мэты і задачы вывучэння арфаграфіі. Змест работы па арфаграфіі ў школе. Псіхалагічныя і метадычныя асновы арфаграфічнай працы ў школе.

Асаблівасці беларускай арфаграфіі. Залежнасць метадаў і прыёмаў навучання арфаграфіі ад прынцыпаў яе пабудовы. Прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння арфаграфіі.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУhttp://www.philology.bsu.by



Арфаграфічная норма. Знаёмства вучняў з арфаграфічным слоўнікам. Роля арфаграфічнага слоўніка для фарміравання арфаграфічных навыкаў. Методыка работы над арфаграфічным правілам.

Практычныя метады і прыёмы навучання арфаграфіі. Арфаграфічны разбор і методыка яго правядзення.

Папярэджанне арфаграфічных памылак. Улік і класіфікацыя арфаграфічных памылак. Грубыя і нягрубыя арфаграфічныя памылкі. Работа над арфаграфічнымі памылкамі.

### 2.5. Методыка граматыкі.

Мэты, задачы, пазнавальнае і практычнае значэнне навучання граматыцы ў школе. Унутрыпрадметныя сувязі ў працэсе навучання граматыцы: марфалогіі на сінтаксічнай аснове, марфалогіі і сінтаксісу ў аспекце культуры маўлення і стылістыкі.

#### 2.5.1. Методыка марфалогіі

Значэнне, задачы навучання марфалогіі ў школе. Спецыфічныя прынцыпы навучання марфалогіі. Лінгвістычныя асновы школьнага курса марфалогіі. Асноўныя паняцці марфалогіі (часціны мовы, граматычная катэгорыя, граматычнае значэнне, словазмяненне) і методыка іх увядзення.

Марфалагічная норма. Улік і класіфікацыя “марфалагічных” памылак. Работа над памылкамі марфалагічнага ўзроўню.

Тыпалогія марфалагічных практыкаванняў. Аналіз тэксту на ўроках марфалогіі. Выяўленне сэнсава-стылістычнай і функцыянальнай ролі знамянальных і службовых часцін мовы.

Марфалагічны разбор, методыка яго правядзення.

Фарміраванне арфаграфічных уменняў і навыкаў пры вывучэнні марфалогіі.

Лінгваметадычная сістэма ўзбагачэння слоўнікавага запасу школьнікаў пры вывучэнні марфалогіі.

#### 2.5.2.Методыка сінтаксісу

Значэнне, мэты, задачы вывучэння сінтаксісу ў школе. Змест і спецыфічныя прынцыпы навучання сінтаксісу. Прапедэтыўнае і сістэматычнае вывучэнне сінтаксісу.

Асаблівасці фарміравання сінтаксічных паняццяў і методыка іх увядзення.

Сінтаксічная норма. Фіксацыя, улік і дыферэнцыяцыя “сінтаксічных” памылак. Методыка работы над імі.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУhttp://www.philology.bsu.by



Тыпалогія сінтаксічных практыкаванняў. Сінтаксічны разбор і методыка яго правядзення.

### 2.5.3. Методыка пунктуацыі

Мэты і задачы вывучэння пунктуацыі ў школе. Змест і этапы вывучэння пунктуацыі. Спецыфічныя прынцыпы методыкі пунктуацыі: назіранне за логіка-прадметнай інфармацыяй сказа, за яго граматычнай будовай і рытмамелодыкай.

Пунктуацыйна-сэнсавы адрэзак як адзінка пунктуацыі. Пунктаграма. Пунктуацыйная норма. Пунктуацыйныя правілы, іх класіфікацыя і методыка работы над імі.

Практычныя метады і прыёмы навучання пунктуацыі. Семантычны аналіз сказа як аснова аналізу пунктуацыйнага. Методыка іх правядзення. Віды практыкаванняў па пунктуацыі.

Папярэджанне пунктуацыйных памылак, іх фіксацыя, улік. Грубыя і нягрубыя пунктуацыйныя памылкі. Работа над пунктуацыйнымі памылкамі.

алення метадычнага майстэрства настаўнікаў. Змест работы метадычных аб'яднанняў (кафедраў). Педагагічныя інавацыі. Школьны кабінет беларускай мовы.

## 3.Методыка развіцця звязнага маўлення вучняў

Развіццё маўлення – адна з асноўных задач навучання роднай мове. Навуковыя асновы методыкі развіцця маўлення (тэорыя маўленчай дзейнасці, тэорыя тэксту, стылістыка і інш.) Асноўныя прынцыпы методыкі развіцця маўлення: адзінства развіцця маўлення і мыслення, ўзаемасувязі развіцця вуснага і пісьмовага маўлення, развіцця маўлення ў сувязі з вывучэннем усіх раздзелаў школьнага курса роднай мовы і інш.

Значэнне, задачы, змест работы па развіцці звязнага маўлення школьнікаў. Паняцце сістэмы ў працы па развіцці звязнага вуснага і пісьмовага маўлення школьнікаў: тэкст як камунікатыўная і дыдактычная адзінка развіцця звязнага маўлення; тыпы маўлення; стылі маўлення; жанры маўлення; асноўныя віды маўленчай дзейнасці: слуханне, гаварэнне, чытанне і пісьмо.

***Тэкст*** як прадукт маўленчай дзейнасці. Фарміраванне ў вучняў паняцця пра тэкст, яго асноўныя прыметы: мадальнасць (наяўнасць адрасата і адрасанта), тэматычнае адзінства, звязнасць, ці структурнае адзінства (віды, сродкі структурнай сувязі), разгорнутасць, паслядоўнасць (кампазіцыя), сэнсавая цэласнасць (спосабы сэнсавай сувязі сказаў у тэксце), завершанасць.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУhttp://www.philology.bsu.by



Методыка азнаямлення з асноўнымі тыпамі маўлення (апавяданне, апісанне, разважанне), з жанрава-стылістычнымі разнавіднасцямі тэкстаў(апавяданне, нататка, інтэрв'ю, ліст, нарыс, рэпартаж, характарыстыка , заява, аўтабіяграфія, рэферат, канспект, анатацыя, водгук, рэцэнзія і інш.).

Сістэма практыкаванняў па развіцці звязнага вуснага і пісьмовага маўлення школьнікаў.

***Пераказы*** ў сістэме працы па развіцці звязнага маўлення вучняў. Класіфікацыя пераказаў: па мэце правядзення (навучальныя і кантрольныя), па спосабе перадачы зместу зыходнага тэксту (падрабязныя, блізкія да тэксту; сціслыя; выбарачныя; з дадатковым заданнем) і інш. Методыка правядзення навучальных і кантрольных пераказаў.

***Сачыненне*** як від работы па развіцці звязнага маўлення, сродак самавыражэння асобы школьніка, яго жыццёвай пазіцыі, унутранага свету. Класіфікацыя сачыненняў: па мэце правядзення (навучальныя і кантрольныя), па месцы выканання (класныя і дамашнія), па крыніцы атрымання ведаў (на аснове жыццёвага вопыту, асабістых назіранняў і ўражанняў; па карціне; на літаратурныя і вольныя тэмы і інш.), па тыпе тэксту (апавяданні, апісанні, разважанні, апавяданні з элементамі апісання і інш.), па жанры (артыкул у газету, водгук, рэцэнзія, рэпартаж і г. д.) і інш. Спосабы падрыхтоўкі да сачынення. Методыка правядзення сачыненняў.

***Пераклад*** як від навучальных практыкаванняў па развіцці маўлення.

Навучанне камунікатыўным якасцям маўлення (правільнасць, дакладнасць, лагічнасць, дарэчнасць, багацце, выразнасць), маўленчаму этыкету. Тыпы практыкаванняў па фарміраванні камунікатыўных здольнасцей, методыка іх правядзення.

Праверка і ацэнка творчых прац вучняў . Класіфікацыя, улік, прыёмы выпраўлення памылак.

Значэнне, задачы, асаблівасці вывучэння стылістыкі. Арганізацыя працы па стылістыцы пры вывучэнні асобных раздзелаў школьнага курса беларускай мовы. Стылістычныя ўменні. Практыкаванні па фарміраванні стылістычных уменняў і навыкаў.

Методыка азнаямлення вучняў з функцыянальнымі стылямі

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУhttp://www.philology.bsu.by



# ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ЧАСТКА

## РЭКАМЕНДАВАНАЯ ЛІТАРАТУРА

### Асноўная

**1.** *Яленскі, М.Г.* Методыка выкладання беларускай мовы. Сучасная лінгвадыдактыка: вучэб. дапам. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей устаноў, якія забяспечваюць атрыманне выш.. адукацыі / М.Г.Яленскі. – Мн. : Адукацыя і выхаванне, 2005. – 224с.

**2.** Методыка выкладання беларускай мовы: вучэб. дапам. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей устаноў, якія забяспечваюць атрыманне выш. адукацыі / М.Г. Яленскі [і інш.]; пад рэд. М. Г. Яленскага. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2007.

**3.** *Яленскі, М.Г.* Методыка выкладання беларускай мовы: практыкум : вучэб. дапам. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей устаноў, якія забяспечваюць атрыманне выш. адукацыі / М.Г.Яленскі, У.П.Саўко, Л.С.Васюковіч; пад рэд. М. Г. Яленскага. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2006. – 336 с.

### Дадатковая

1. *Валочка, Г. М.* Навучанне перакладу ў школе. – Мн., 1999.
2. *Валочка, Г. М.* Развіццё звязнага маўлення школьнікаў. – Мн., 2005.
3. *Варановіч, З.Б.* Практыкум па методыцы выкладання беларускай мовы: для студэнтаў філалагічнага факультэта: у дзвюх частках. Частка I. Агульныя пытанні выкладання методыкі / З.Б. Варановіч, Л.М.Гамеза, І.М.Саматыя, С.М.Крылова. – Мінск, 1998. – 31 с.
4. *Воителева, Т.М.* Теория и методика обучения русскому языку : учеб. Пособие для вузов / Т.М.Воителева. – М.: Дрофа, 2006. – 319 с.
5. *Выгонная, Л. Ц.* Фанетыка беларускай мовы ў школе. – Мн., 1995.
6. Выкладанне беларускай мовы ў школе / М. Г. Яленскі, Л. С. Васюковіч, І. М. Саматыя [і інш.]. – Мн., 1994.
7. *Гамеза, Л. М.* Лінгваметадычная сістэма ўзбагачэння слоўнікавага запасу школьнікаў / Л.М.Гамеза. – Мн., 2002.
8. *Даніловіч, М. А.* Вывучэнне фразеалогіі на ўроках мовы. – Мн., 1991.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУhttp://www.philology.bsu.by




9. *Ермаловіч, А. В.* Сачыненні-апісанні: тэорыя і практыка. – Мн., 2005.
10. *Красней, В. П.* Грані слова: факультатыўны курс "Лексіка іфразеалогія беларускай мовы". – Мн., 1986.
11. *Лаўрэль, Я. М.* Вывучэнне марфалогіі ў школе / Я. М. Лаўрэль, Т. Р. Новікава, С. А. Язерская. – Мн., 1991.
12. *Литвинко, Ф. М.* Методика изучения разделов школьного курса русского языка (функциональный подход): курс лекций для студентов филологического факультета. – Мн.: БГУ, 2001.
13. *Литневская, Е.И.* Методика преподавания русского языка в школе: учеб. пособие для студентов высших учебных заведений / Е. И. Литневская, В. А. Багрянцева. – М.: Академический проект, 2006. – 590 с.
14. *Ляшчынская, В. А.* Методыка выкладання беларускай мовы: задачы і практыкаванні. – Мн., 1998.
15. *Ляшчынская, В. А.* Методыка выкладання беларускай мовы: вучэб. дапаможнік / В.А.Ляшчынская, З.У.Шведава. – Мінск : РІВШ, 2007. – 252с.
16. *Малажай, Г. М.* Алімпіяды па беларускай мове / Г. М. Малажай, В. П. Красней. – Мн., 2001.
17. *Малажай, Г. М.* Пазакласная праца па беларускай мове / Г. М. Малажай, С. Р. Рачэўскі. – Мн., 1990.
18. Методика преподавания русского языка в школе: учебник для студ.высш.пед.учеб.заведений / М.Т.Баранов [и др.]; под ред. М. Т. Баранова. – М.: Академия, 2000. – 358 с.
19. *Міцкевіч, К.* Методыка роднае мовы. – Менск, 1926.
20. *Міцкевіч, К.* Методыка роднай мовы / К. Міцкевіч, В. Тэпін. – Менск, 1930.
21. Обучение русскому языку в школе: учеб.пособие для студентов педагогических вузов / Е.А.Быстрова, С. И. Львова, В.И. Капинос [и др.]; под ред. Е.А.Быстровой. – М.: Дрофа, 2004. – 204 с.
22. *Мурина, Л. А.* Методика русского языка в школах Белоруссии: учеб. пособие / Л. А. Мурина. – Минск: Университетское, 1990. – 320 с.
23. *Протчанка, В. У.* Актуальныя праблемы тэорыі і практыкі навучання беларускай мове. – Мн., 2001.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУhttp://www.philology.bsu.by



24.*Протчанка, В. У.* Вывучэнне сінтаксісу ў школе. Словазлучэнне. Просты сказ. – Мн., 1981.

25.*Протчанка, В. У.* Вывучэнне сінтаксісу ў школе. Складаны сказ. – Мн.,1984.

26.Теория и пракика обучения русскому языку: учеб. пособие для студ. высш. пед. учеб. заведений / Е.В.Архипова, Т.М.Воителева, А.Д.Дейкина [ и др.]; под ред. Р.Б.Саботкоева. – М.: Издательский центр “Академия”, 2005.— 320с.

27.*Яленскі, М. Г.* Развіццё вуснай мовы вучняў: 4–6 класы. – Мн., 1985.

28.Адукацыйны стандарт. Агульная сярэдняя адукацыя. Беларуская мова // Общее среднее образование. Социально-гуманитарные дисциплины. – Минск, 1999.

29.Інструкцыя аб парадку фарміравання вуснай і пісьмовай мовы ў агульнаадукацыйных установах //Настаўніцкая газета, кастрычнік 2008 г.

30.Канцэпцыя прадмета “Беларуская мова”.

31.Нормы ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў па беларускай мове // Беларуская мова і літаратура. – 2003. – №4.

32.Праграмы і падручнікі па беларускай мове для агульнадукацыйнай сярэдняй школы.

33.Настаўніцкая газета.

34.Роднае слова.

35.Беларуская мова і літаратура.

36.Русский язык в школе.

37.Русская словесность.

38.Інтэрнэт-рэсурсы.